# СЕКЦИЯ 2
## ЛИНГВИСТИЧЕСКИЕ КОМПОНЕНТЫ В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ, ЛИТЕРАТУРЕ И КУЛЬТУРЕ

**Н.М. Борсук**
*(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт,
г. Брэст, Беларусь)*

### НАВАГРАДЧЫНА ХІХ СТАГОДДЗЯ ВА ЎСПРЫМАННІ ПІСЬМЕННІКАЎ, НАРОДЖАНЫХ НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ

Наваградчына... Асаблівае месца займае яна ў творчасці беларускіх пісьменнікаў. І перш-наперш у лёсе мастакоў слова, народжаных на гэтай зямлі. Адам Міцкевіч (нарадзіўся на хутары Завоссе на Наваградчыне) называў яе Наваградчына, Літва, Бацькаўшчына. Удалечыні ад радзімы, у цішыні акерманскіх стэпаў, ён чуў, "як матыль гайдае дзесь травіну", "як таямнічы вуж крадзецца недзе", "ціхі кліч з Літвы". Вобразы радзімы праходзяць праз усю эпапею "Пан Тадэвуш". Смутак па краі дзяцінства параўноўвае паэт з першым каханнем у эпілогу паэмы. А. Міцкевіч усё жыццё шчыра сябраваў з аднакласнікам, ураджэнцам гэтых мясцін Янам Чачотам (нарадзіўся ў вёсцы Малюшычы Наваградскага павета).

Яны разам вучыліся ў Наваградскай школе святых дамініканцаў, ці "белакаптурных", як называлі іх вучні (ад адзення – белы каптур), аб чым паэтычна расказаў Адам Міцкевіч у вершы "Ямбы да імянін Яна Чачота": "Хто ж, апроч нас з табой, Яне, сваволіў, / Што аж трэсліся сцены. Бывала, у школе? / Хто ж да нас белакаптурным так смела пярэчыў, / Пад палкі іх горда падстаўляючы плечы?..". Менавіта ў гэтыя часы хлопцы зацікаваліся народнай творчасцю, падарожнічалі па ваколіцах Наваградка, збіралі легенды, песні, некаторыя з іх пакладзены ў аснову паэтычных твораў абодвух творцаў. Вось як пра гэта ўспамінае іх сябар, зямляк Ігнат Дамейка (нарадзіўся ў мястэчку Мір Наваградскага павета): "Сябры хадзілі на кірмашы, на царкоўныя ўрачыстасці, бывалі на сялянскіх вяселлях, дажынках і хаўтурах. У тыя школьныя часы ўбогая страха і народная песня распалілі ў абодвух першы паэтычны агонь. Адам хутка ўзнёсся да высокай сферы сваіх цудоўных твораў. Ян жа да смерці застаўся верны народнай паэзіі..." [3, с. 8].

"Сталіца Міндоўга" – так з гонарам называў Наваградак Вінцэсь Каратынскі (нарадзіўся ў вёсцы Селішчы Наваградскага павета). Пісьменнік запрашае чы-

тача падарожных запісаў “Наваградчына і Наваградак” угледзіцца ў твар горада, суровы і прыгожы, які павернуты да Нёмна. І толькі апынуўшыся разам з беларуска-польскім пісьменнікам на высокай Замкавай гары з дзвюма вяршынямі вежаў, якая, як і ўвесь горад, пануе над наваколлем, усведамляем: чаму В. Каратынскі столькі ўвагі надае месцузнаходжання Наваградка.

Аўтар апісвае густа парослыя хмызняком пагоркі, усеяныя шматлікімі магіламі палеглых абаронцаў і захопнікаў – ліцвінаў, русінаў, татараў, крыжакоў, шведаў, французаў, якія спрабавалі прарвацца да замка, але толькі заслалі палі сваімі целамі. Апісанне поля сечы, на якім вялі барацьбу ваяры пад кіраўніцтвам “прыгожай княгіні” (Гражыны) супраць манахаў, знаходзім у паэме А. Міцкевіча “Гражына”: “Абаронцы і тыя тут, што нападалі, / Шчыры й вечны спакой першы раз зваявалі!” [2]. У вершы “Наваградскі замак” Яна Чачота ўзгадваюцца страшэнныя рэчы, што ўчынялі шведы ў адносінах да дзяцей: “А дзетак маленькіх стаўлялі за лавы / І лавай давілі пад крык іх”. І ўсё гэта дзеля забавы.

На старонках падарожных запісаў узгадваюцца старонкі з гісторыі Наваградка. Горад зведаў уладу Эрдзівіла, літоўскага князя, які заняў абязлюдненую праз татар мясцовасць і падняў з руінаў замак; уладу Міндоўга, які зрабіў Наваградак сталіцаю, быў ахрышчаны на гэтай зямлі і каранаваўся; Вітаўца, дзякуючы намаганням якога быў адноўлены наваградскі замак, пабудаваны фарны касцёл. Менавіта ў ім быў ахрышчаны Адам Міцкевіч. Сюды прыбегла маці маленькага Адама прасіць перад абразом Маці Божай дапамогі для хворага дзіцяці, пра што ўзгадваецца ў пачатку паэмы “Пан Тадэвуш”: “О Матка Боская, што ў Чанстахове ў храме / Глядзіш спагадліва, што ў Вострай свеціш Браме, / Што беражэш Наваградак мой з верным людам! / Як ты ў жыццё мяне калісь вярнула цудам...” [2].

Тут, у Наваградку, Уладзізлаў Ягайла ўзяў шлюб з Соф’яй Гальшанскай, Казімір IУ у 1448 годзе сабраў сойм, у якім удзельнічалі адны ліцвіны з мэтаю супакоіць літоўскую шляхту, пасвараную з каронай на Люблінскім сойме. Тут 22 тыдні наперамену з Менскам засядаў трыбунал Вялікага княства Літоўскага... Усё пералічанае вышэй і дае падставы В. Каратынскаму назваць зямлю, дзе раскінуўся Наваградак, “музеем чалавецтва” [1, с. 192].

Гэтую думку паэтычна выказаў у вершы “Наваградскі замак” і Ян Чачот, сын “горада слаўнага Міндоўга”: “На Замкавай ціхай гары колісь доўга / Я слухаў сцен даўніх каменне. / Дзве вежы вякі тут збіраюць на веча – / Паслухаць іх спыніцца кожны, / Руіны царквы ажываюць штовечар – / Ад зданяў трасецца набожны” [3].

У падарожных запісах В. Каратынскі прадказвае трагічны лёс славутасці наваградскай зямлі: ад замка засталіся толькі дзве вежы: адна пасярэдзіне, моцная, роўная, непашчэрбленая, гладкая, хоць яе вяршыню і карануе расліннасць; ад другой па сутнасці засталася толькі адна сцяна, якая стаіць над стромым абрывам, расколатая вертыкальна пасярэдзіне, здаецца, што яна спаўзае ўніз разам з гарою, якая пастаянна абсыпаецца. Балюча пісьменнікуназіраць, як мясцовае насельніцтва расцягвае прыгожую, цвёрдую, як сталь, цэглу сярэдняй вежы для практычнага выкарыстання. Гэтая сумная карціна выклікае ў памяці пісьменніка жывы яшчэ яскравы прыклад таго, як святыню Госпада, што стаяла

на гэтых жа валах, ператварылі ў руіны. Нельга не пагадзіцца з меркаваннем Вінцэся Каратынскага: "Гэтыя маўклівыя руіны так шмат гавораць душы таго, хто іх разумее! Колькі яны маглі б расказаць, калі б іх хацелі паслухаць!" [1. с. 196]. І зноў хочацца звярнуцца да верша Яна Чачота "Наваградскі замак", пачатак якога працягвае вышэйвыказаную думку аўтара падарожных запісаў. Як бачна, мастак слова запрашае чытача вучыцца бачыць душою, бо толькі такому "воку адчыніцца, так і тлумачаць / Усё, нават "дзіва" любое".

Позірк чытача В. Каратынскі спыняе на фарным касцёле ля падножжа Замкавай гары. Згодна паданню ён быў пабудаваны на месцы паганскага капішча Перуна. У касцёле з правага боку, у сцяне капліцы, знаходзіцца помнік палеглым у Хоцімскім паходзе (фундатарам выступіў Ян Рудаміна, наваградскі кашталян), на вялікім алтары – абраз Божага Ператварэння.

Не застаецца па-за ўвагай падарожніка езуіцкі калегіум, мураванае, вялізнае збудаванне, налева ад рыначнага пляца. Пры ім працавала свецкая школа. Перад калегіумам узвышаўся касцёл езуітаў (у 1751 годзе ён згарэў, а адбудаваны нанова быў у хуткім часе зачынены па прычыне скасавання езуіцкага ордэна і ўплыў на выхаванне перайшло да дамініканаў, у часы В. Каратынскага ў мурах калегіума знайшлі прытулак пачатковая школа, магістрат, гарадская бальніца, аптэка і інш.).

Свой касцёл у Наваградку мелі і дамініканы яшчэ ў часы Гедыміна, – працягвае аповед В. Каратынскі. Ёсць меркаванне, што яны перабраліся сюды з Любчы. Пазней фундацыю касцёла, які быў пабудаваны з дрэва, ажыццявіў Крыштаф Хадкевіч, канюшы Вялікага княства Літоўскага. Каменную святыню з кляштарам часоў В. Каратынскага пабудавалі самі дамініканы пасля пажару. Іх заслуга бачыцца ва ўтрыманні ў кляштары шасцікласнай школы, якая перайшла дамініканам ад езуітаў. Гонарам навучальнай установы быў яе вучань Адам Міцкевіч (1808–1816).

Дарэчы, у Наваградку быў касцёл дамініканак, недалёка ад рынку; за колькі дзесяткаў крокаў ад яго знаходзіўся касцёл і кляштар францішканаў; у баніфратраў была толькі капліца ў кляштары, дзе яны ўтрымлівалі дзесяць ложкаў для хворых, бо адну з мэт свайго існавання бачылі ў дапамозе нямоглым. Пісьменнік Нямцэвіч у сваіх запісах узгадваў, як падчас праезду праз Наваградак (1819) знайшоў прытулак у кляштары ўніятаў-базыліянаў, дзе яму давялося пабачыць абраз Найсвяцейшай Маці, пра які ў старых кантычках ёсць песня, што пачынаецца са слоў: "Найсвяцейшая Панна, Наваградская Пані". У падарожных запісах В. Каратынскага ўзгадваюцца яшчэ мячэць (драўляная), якую мелі татары, сінагога (мураваная). Пералічыўшы значную колькасць бажніц на "паўчварта тысяч насельніцтва", пісьменнік задаецца пытаннем: Наваградак мог паскардзіцца на нястачу духоўнай ежы? Праявы набожнасці адмоўна ці станоўча ўплывалі на стан горада і яго жыхароў? Адказ на пастаўленае пытанне Вінцэсь Каратынскі непасрэдна не дае, тым самым, ён запрашае чытача падыскусаваць на гэты конт. Аб пазіцыі аўтара падарожных запісаў па акрэсленай праблеме, думаецца, няцяжка здагадацца.

Цэлы раздзел сваёй кнігі В. Каратынскі прысвячае адкрыццю гімназіі ў Наваградку. З гэтага бачна, што пісьменнік шчыра зычыў развіццю асветы на роднай зямлі. Па яго перакананні, задача школы – выхоўваць літасцівых самарыцянаў,

людзей спагадлівых да сваіх бліжніх, спрыяць безупыннаму самадасканаленню маладых людзей: "Свецкая навука дае дзецям у рукі толькі прылады працы і вучыць, як імі карыстацца, а рэлігія і пабудаваная на яе аснове навука паказвае, дзе, калі і для чаго трэба выкарыстоўваць гэтыя прылады, каб тое, што будзе плёнам гэтай дзейнасці, ішло на славу Богу і бліжняму" [1, с. 206]. Адсюль, безумоўна, бачна, якое значэнне пісьменнік надаваў рэлігіі, настаўнікам.

З прыемнасцю канстатуе В. Каратынскі наступныя факты: у горадзе існуе ўстанова Дабрачыннасць, "дзе колькім дзесяткам хлопцаў з найбяднейшай шляхты даюць жытло, стол і адзенне і пасылаюць у школу" [1, с. 203]; узаемаадносіны паміж жыхарамі горада шчырыя, простыя, ветлівыя, гасцінныя; вулічнай шпаны, гэтага няшчасця любога вялікага населенага пункта, Навагрудак не ведае. Вышэйпералічаныя адметнасці гарадскога жыцця тлумачацца, з аднаго боку, славянскай лагоднасцю, з другога, – выхаваннем.

Не пакідае В. Каратынскага абыякавым і пошук адказу на пытанне: чаму ў развіцці горада назіраецца застой? Бясспрэчна, варожыя навалы, пажары былі частымі спадарожнікамі Навагрудка. Тым не менш, горад меў шэраг прывілей. Напрыклад, пры Жыгімонце І ён атрымаў Магдэбургскае права. Можна доўга разважаць пра неразвітасць гандлю, слабую прамысловасць, пра тое, што плён дзейнасці жыхароў Навагрудка амаль выключна спажываецца самім горадам, але як трапна стан жыхароў Навагрудка ахарактарызаваў аўтар пры дапамозе мясцовай прымаўкі: "Мой бацька нікому не вінен – у аднаго пазычае, другому аддае".

На наш погляд, заслуга Вінцэся Каратынскага бачыцца яшчэ і ў тым, што лёс "сталіцы Міндоўга" падаецца ім на фоне жыцця Навагрудчыны. Пісьменнік не толькі маляўніча апісвае, як "Бацька літоўскіх рэк" (Нёман) падзяляе гэтую зямлю на два зусім непадобныя адзін да аднаго краявіды, але і спыняе ўвагу на характары і паходжанні насельнікаў гэтах абшараў, урадлівасці зямель, занятках жыхароў краю. Дарэчы, у А. Міцкевіча ў паэме "Пан Тадэвуш" знаходзім апісанне шляхты, якая нічым амаль не адрозніваецца ад сялян: "сівая капота замест сярмягі. Зрэдку кніжка, чытаная па складах, крыху сякой-такой пальшчызны, уплеценай у русінскую мову народа, трохі шляхецкай пыхі і пры згадцы аб тым, што продкі галілі галовы і хадзілі пры шаблі, "жаць і прасці ў пальчатках" [1, с. 190].

Бачна, што В. Каратынскі захапляецца сваімі землякамі, іх працавітасцю, шчырасцю, аптымізмам. Нягледзячы на маркотнае, таямнічае замыканне насельнікаў у сабе, нявыказаны сум і бяссілле, што пануе над краем, жыхары з прагнасцю цягнуцца да навукі,чытаюць кніжкі, газеты. Аўтарам падарожных запісаў узгадваецца вядомая ва ўсім свеце бібліятэка ў Шчорсах. Па гэтай прычыне В Каратынскі не знаходзіць адказ на пытанне: чаму "пры такой колькасці прагных да работы рук, пры такім жаданні працаваць" яго родная зямля не стала "зямлёю абяцанаю"? Няўжо прычына толькі ў недахопе фінансавых сродкаў? Наконт гэтага, думаецца, з пісьменнікам можна паспрачацца.

Дыяменты думак і пачуццяў Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Вінцэся Каратынскага непадуладны забыццю. Яны ззяюць ў паэтычных творах, на старонках падарожных запісаў. І не толькі таму, што ў кожным радку творцы пакінулі "душы часціцу", але і таму, што пісьменнікі прыадкрываюць гісторыкам, літаратарам, краязнаўцам, рэстаўратарам старонкі жыцця Навагрудка сярэдзіны XIX стагоддзя.

## Літаратура

1. Каратынскі, В. Творы / Вінцэсь Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. – 2-е выд., дап. – Мн. : Маст. літ., 1994. – 406 с.

2. Міцкевіч, А. Выбраныя творы: / Адам Міцкевіч ; пер. з пол. мовы ; уклад., прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мн. : Бел. кнігазбор, 2003. – 637 с.

3. Чачот, Я. Наваградскі замак: Творы / Ян Чачот ; уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мн. : Маст. літ., 1989. – 327 с.